# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Ліда, 2021 г.*

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*
## 11 клас
## Варыянт 1

**Заданне 1.**

**А**

| Колькасць літар і гукаў супадае | Літар больш, чым гукаў | Гукаў больш, чым літар |
|---|---|---|
| *рэдакцый* | *аддзелаў* | *рэдкалегія* |
| *прадстаўнікі* | *загадчыкі* | *прадукцыі* |
| | *уваходзяць* | |

**Б**

*Менеджар, намеснікі, камерцыйны, выдавецкая, прынцыпова важных.*

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 2.** ***Магчымыя варыянты адказаў:***

А. *аловак*, таму што гэтае слова адназначнае / іншыя словы мнагазначныя.
Б. *апокрыф – фейк*, таму што гэта не сінанімічныя словы.
В. *ганаровы тытул – тытул кнігі*, таму што гэта амонімы / не мнагазначныя словы.
Г. *рукапісны*, таму што не звязана з тэматычнай групай “прамысловы выраб кніг”.

*Пры ацэнцы трэба ўлічваць лагічнасць тлумачэння. Могуць прымацца іншыя адказы пры належным лагічным абгрунтаванні. За кожны правільна запісаны элемент – 0,5 бала, за кожнае абгрунтаванае тлумачэнне – 1 бал.*

**Заданне 3.**

| | |
|---|---|
| А | кнігадрукавання |
| Б | адбылося |
| В | стагоддзя |
| Г | трэць (нулявы суфікс і нулявы канчатак) |
| Д | адсутнічаць |
| Е | каста |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 4.**

| | Займеннік (форма ў сказе) | Пачатковая форма | Разрад | Сінтаксічная функцыя |
|---|---|---|---|---|
| А | **што** | **што** | адносны | **дзейнік** |
| Б | усё | **увесь** | **азначальны** | дапаўненне |
| В | **яе** | **яна** | **асабовы** | **дапаўненне** |
| Г | (да) сябе | **не мае** | **зваротны** | **акалічнасць** |

*За кожную правільна запоўненую клетку – 0,5 бала.*

**Заданне 5.**

| Умова | Магчымыя ўзоры адказаў |
|---|---|
| Складаназалежны сказ з даданай азначальнай | Найлепшы дзень для арганізацыі выставы старажытнай кнігі – 23 красавіка, які з’яўляецца Сусветным днём кнігі і аўтарскага права. |
| Складаназалежны сказ з даданай месца | Да ўказанай галоўнай часткі нельга далучыць дададную акалічнасную месца, таму што ў галоўнай частцы няма ўказальных слоў, з якімі звычайна звязваюцца такога тыпу дададныя часткі. |
| Складаназалежны сказ з даданай прычыны | Найлепшы дзень для арганізацыі выставы старажытнай кнігі – 23 красавіка, таму што ён з’яўляецца Сусветным днём кнігі і аўтарскага права. |
| Складаназалежны сказ з даданай уступкі | Найлепшы дзень для арганізацыі выставы старажытнай кнігі – 23 красавіка, хоць ёсць і іншыя, вартыя для правядзення такога мерапрыемства дні. |
| Складаназалежны сказ з даданай умовы | Найлепшы дзень для арганізацыі выставы старажытнай кнігі – 23 красавіка, калі толькі не перашкодзяць абставіны. |
| Складаназалежны сказ з даданай параўнальнай | Найлепшы дзень для арганізацыі выставы старажытнай кнігі – 23 красавіка, як найлепшы дзень для выставы кветак – свята 8 Сакавіка. |

*За кожны правільна падабраную частку сказа або тлумачэнне немагчымасці яе ўтварэння – 1 бал.*

**Заданне 6.**

| Слова (спалучэнні слоў) з памылкай | Выпраўлены варыянт | Тлумачэнне |
|---|---|---|
| цікаўныя (факты) | цікавыя (факты) | *Цікавы* – які выклікае цікавасць.<br>*Цікаўны* – які хоча ўсё ведаць. Нашаму кантэксту адпавядае слова *цікавы*. |
| даследванні | даследаванні | Калі 1-й асобе адзіночнага ліку дзеяслова заканчваецца на *-ую, -юю (даследую),* то ў інфінітыве пішацца суфікс *-ава- (даследаваць).* Адпаведна, і ў назоўніку, утвораным ад дзеяслова, будзе пісацца суфікс *-ава- (даследаванні).* |
| большую палову | большую частку; больш, чым палову | *Палова* – гэта адна з дзвюх роўных частак, таму яна не можа быць ні большай, ні меншай. |
| аўдыёкнігі | аўдыякнігі | У ненацiскным становішчы рускамоўнае спалучэнне *ио* перадаецца як *ія, ыя.* |
| лепш усяго | лепш за ўсё | Пры простай форме вышэйшай ступені параўнання прыслоўяў і прыметнікаў залежнае слова ставіцца ў форме вінавальнага склону з прыназоўнікам *за.* |
| знікнуць чарніла | знікне чарніла | Назоўнік *чарніла* ў беларускай мове ніякага роду і толькі адзіночнага ліку. |

*За кожную правільна вызначаную памылку – 0,25 бала, за кожнае правільнае выпраўленне – 0,25 бала, за кожнае правільнае тлумачэнне – 0,5 бала.*

**Заданне 7.**

У Сярэднія вякі (Сярэднявеччы, Сярэдневякоўі) вытворчасць кніг засяродзілася (сканцэнтравалася) ў манастырскіх скрыпторыях, дзе працавала па 20-30 чалавек. Звычайна самы пісьменны з іх чытаў кнігу ўслых, а астатнія перапісвалі яе з голасу. Быў і падзел працы: адны манахі проста капіравалі (капіявалі) тэксты, іншыя перапісвалі найбольш важныя кнігі каліграфічным почыркам. Прадукцыйнасць працы аднаго перапісчыка не перавышала чатырох старонак за дзень. «Гэта праца цяжкая, – пакінуў адзін з манахаў скаргу на палях перапісанай ім кнігі. – Яна псуе зрок, згінае спіну і прымушае балець усё цела. Як марак, што (які) нарэшце вяртаецца ў порт, пісар з нецярпеннем (нецярплівасцю) чакае моманту, калі дойдзе да апошняга радка».

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,1 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| ***Мастацкі твор*** | ***Нумары правільных хэштэгаў*** | ***Нумары няправільных хэштэгаў*** |
|---|---|---|
| “Непаўторная вясна” | 3 | 1, 2, 4, 5, 6 |
| “Людзі на балоце” | 1, 2 | 3, 4 |
| “Каласы пад сярпом тваім” | 2, 4, 5 | 1, 3 |
| “Зацюканы апостал” | 4 | 1, 2, 3, 5 |

*За кожнае правільнае вызначанае месца хэштэга – 0,3 бала.*

**Заданне 9.**

| | |
|---|---|
| **Твор** | **“Явар і каліна”** |
| **Аўтар** | **Янка Купала** |

Песняй вясны лебядзінаю,
Скінуўшы зімнія чары,
Шэпчуцца явар з калінаю
Ў сумнай даліне над ярам.

Лісцікі зеленяй хваляцца
Небу панятлівай мовай:
Росамі мыюцца раніцай,
Песцяцца сонцам паўднёвым.

| | |
|---|---|
| ***Вершаваны памер арыгінальнага тэксту*** | 3-стопны дактыль |
| ***Вершаваны памер “перакладу”*** | 3-стопны амфібрахій |

*За правільнае вызначэнне твора, аўтара і памераў – па 1 бале. Правільнае ўзнаўленне арыгінальнага твора – 2 балы; за кожную (любога тыпу) памылку (акрамя варыянтных знакаў прыпынку) ад 2 балаў здымаецца 0,1 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 10.**

Пры ацэнцы трэба ўлічваць правільнасць вызначэння пісьменніка-юбіляра (0,5 бала), трапнасць і арыгінальнасць назвы выставы (0,5 бала), аргументацыю назвы (1 бал), правільна названыя кнігі пісьменніка (па 0,5 бала) і правільнасць, трапнасць, арыгінальнасць кожнай анатацыі (па 0,5 бала).